**УДК 821.111**

## ПРАБЛЕМА СВАБОДЫ ВЫБАРУ Ў РАМАНЕ ДЖ. УІНТЭРСАН «ЯРМО» (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГЕРАКЛА)

***А.Ю. БУКА***
***(Прадстаўлена: канд. філал. навук, дац. Н.В. НЕСЦЕР)***

*Разглядаецца праблема свабоды выбару ў рамане Дж. Уінтэрсан «Ярмо» (Weight, 2005) на прыкладзе Геракла. У рамане Дж. Уінтэрсан не проста перарабляе грэчаскі міф пра Атланта, яна стварае зусім іншую гісторыю, пра людзей і іх праблемы, у сувязі з чым твор набывае глыбокае філасофскае значэнне, у ім раскрываецца важнасць і цяжкасць свабоды выбару.*

Геракл – герой у грэчаскай міфалогіі, сын бога Зеўса і смяротнай жанчыны Алкмены. Так як Геракл быў пазашлюбным сынам, Гера не ўзлюбіла яго, аднак, па адным з з міфаў, Зеўс і Афіна хітрасцю заставілі Геру пакарміць Геракла сваім малаком, аднак ён быў настолькі ненасытны, што багіна адштурхнула героя, і кропля малака, якая ўпала, ператварылася ў Млечны шлях.

Пазней Геракл ажаніўся з Мегарай, дачкой фіванскага цара Крэонта. Аднак Гера наслала на героя вар'яцтва і Геракл у гневе забівае сваіх дзяцей. Ачуняўшы, Геракл адпраўляецца ў выгнанне, дзе пачынае служыць Эўрысфею, дзе і выконвае свае знакамітыя 12 подзвігаў. Адзінаццатым яго подзвігам было прынесці яблыкі Геспірыд. Менавіта гэты міф бярэ Дж. Уінтэрсан за аснову твора «Ярмо».

У рамане чытач упершыню сустракае Геракла, калі ён прыходзіць да Атласа. Яго паводзіны і характар застаўляюць жадаць лепшага. У кнізе «Возрождение искусства лжи» даследчыца Н.С. Паваляева вызначае яго характар так: «Геракл – образ карикатурный: это грубый мужлан, пьяница и обжора, который крушит всё на своём пути, беспрестанно похваляется своей физической силой и в особенности – своим пенисом» [1, с. 268].

Герой вельмі падкі да жанчын. Яму ўсё роўна, ці то перад ім багіня, ці амазонка, калі герой захацеў авалодаць любой жанчынай, ён заўсёды дасягне сваёй мэты. Нават калі асобы жаночага полу побач не апынулася, ён дапаможа сабе сам.

Адна з жудасных гісторый «палявання» на жанчыну апісваецца ў творы. Калі Геракл убачыў Іпаліту, царыцу амазонак, ён вырашыў дабіцца яе. Аднак амазонка была вельмі хуткая і Геракл не мог яе дагнаць. Нарэшце, калі дабыча была ў руках, Геракл спытаў амазонку, ці выйдзе яна за яго замуж. Але Іпаліта адмовіла Гераклу, тады герой забіў яе.

Відавочна, Геракл спалучае ў сабе рысы бога і звар'яцелага чалавека, які часта выпівае і заляцаецца да жанчын. Міфалагічны герой таксама мае гэтыя рысы, аднак у рамане Дж. Уінтэрсан менавіта яны робяць Геракла непазнавальным і больш сучасным. Аўтарка парадзіруе характэрны міфалогіі пансуалізм, перабольшвае значнасць сэксуальнага жыцця героя, тым самым робячы яго падобным на чалавека. Згодна з тэорыяй аўстрыйскага псіхааналітыка З. Фрэйда, Геракла можна ахарактарызаваць як персаніфікаванае ўвасабленне «Яно», для якога характэрныя два першасныя пазывы: сэксуальныя інстынкты і садызм, згодна з якімі ён і рааатаўляе прыярытэты. Так, расійская даследчыца творчасці Дж. Уінтэрсан К.У. Тэга адзначае: «Геракл, неспособный на глубокое чувство, умирает на фоне заката античного мира с его культом телесности, столь близкой герою» [2, с. 380].

Геракл вядзе сябе як нявыхаваны падлетак з забяспечанай сям'і. Ён лічыць сябе героем, бо ніхто не адважваецца паспорыць з такім волатам на гэты конт, таму ён і патрабуе, каб да яго ставіліся, як да героя: «Heracles's strength was a cover for his weakness. Nobody argues with a man who is twice as tall, twice as heavy, twice as hot-tempered, and three times the big head. Argue with Heracles, and he'd crush you. So he was always right. If he took his chariot in to be fixed, it was „Right away Mr Heracles, we weren't busy, we'll do it now,‟ and the long line of chariots waiting to have their axles repaired could moulder to dust, while Heracles's special racing model was brought to the front of the line»[10] [3, p. 17]. Для Геракла калясніца важней за адносіны да акаляючых, бо ён лічыць сябе вышэй за іншых.

Па паводзінах героя зразумела, ён не прыслухваецца да меркаваннем іншых, заўсёды лічыць сябе правым, нарцыс і цынік. Адной з галоўных яго рыс з'яўляецца прамалінейнасць, ён ніколі не думае над сказаным, яго словы вельмі рэзкія, чым і адрозніваюцца ад больш паэтычнай мовы Атласа.

[10] «Сіла Геракла была прыкрыццём яго слабасці. Ніхто не спрачаецца з чалавекам, які ў два разы вышэйшы, у два разы цяжэйшы, у два разы больш злосны і ў тры разы . Паспрачаешся з Гераклам, і ён раздушыць цябе. Так ён заўсёды меў рацыю. Калі ён прывозіў у рамонт сваю калясніцу, то гэта азначала: «Зараз, Містэр Гераклес, мы не занятыя, мы зробім усё цяпер», і доўгая чарада калясніц, якія чакаюць рамонту сваіх восяў, магла ператварыцца ў пыл, у той час як спецыяльнай гоначнай мадэлі Геракла адводзілася першае месца» (Пераклад наш. – *А.Б.*).

Такім чынам, Геракл з’яўляецца прадстаўніком маскулiннай культуры. Згодна з яго светапоглядам, галоўную каштоўнасць маюць матэрыяльныя рэчы, поспех у подзвігах, фізічная сіла і выразнае размежаванне ў разуменні роляў мужчына і жанчыны. Любы канфлікт ён вырашае па прынцыпе фізічнай барацьбы. У сваю чаргу Атлас – прыклад фемiннай культуры, ён не можа проста адпусціць небасхіл, бо адчувае маральны доўг, ён валодае здольнасцю спачуваць.

Геракл верыць, што ў яго, як і ва ўсіх астатніх, ёсць нейкая «місія», прызначэнне, якое ён павінен выконваць па жыцці: «We’ve all got our burdens to bear, – кажа ён Атласу, – Your punishment is to hold up the universe. My punishment is to work for a wanker»[11] [3 p. 9]. Як і Атлас, Геракл прытрымліваецца меркавання наканаванасці лёсу, і, у адрозненне ад тытана, не змяняе яго, што вядзе да гібелі героя.

Геракл упэўнены, што ён павінен і далей выконваць свае подзвігі, бо ў гэтым яго прызначэнне. Таму ён трапляе ў сапраўдны крызіс, калі вымушаны змяніць род заняткаў і выконваць працу Атласа. Проста стаяць на месцы і трымаць на сабе небасхіл – гэта незвычайная справа нават для такога волата. Таму і рэакцыя ў героя адпаведная: «Heracles was more afraid now than he had been in his whole life. He could accept any challenge except the challenge of no challenge. He knew himself through combat. He defined himself by opposition. When he fought, he could feel his muscles work and the blood pumping through his body. Now he felt nothing but the weight of the world»[12] [3, p. 19]. Яму характэрны страх, які можа сустрэць чалавек змяніўшы род дзейнасці. Герой заўжды думаў, што яго занятак – выконваць подзвігі да канца сваіх дзён. І калі сітуацыя рэзка перамянілася, у яго жыцці наступае крызіс успрымання сябе.

Фізічная сіла не дапамагае Гераклу пазбавіцца веры ў перадвызначанасць. Гера, якую Геракл таксама сустракае ў садзе, спрабуе даказаць герою, што ён сам стане прычынай сваёй смерці, бо не разумее, што яго жыццё залежыць толькі ад яго самаго: «„You must bring about your own ruin, Heracles.‟ „But you’ll be there to help me to it, won‟t you, Hera?‟ „If I seem like fate to you, it is because you have no power of your own.‟ „No man was ever stronger.‟ „No man was ever weaker than you.‟ „You talk in riddles, like a woman.‟ „Then I will speak plainly, like a man. No hero can be destroyed by the world. His reward is to destroy himself. Not what you meet on the way, but what you are, will destroy you, Heracles»[13] [3, p. 12].

Ва ўсіх сваіх бедах Геракл лічыць вінаватай жонку свайго бацькі, Геру. Багіня не любіць героя, бо ён пазашлюбнае дзіця. Аднак гэта толькі прыкрыццё няздольнасці адказваць за свае ўчынкі і прымаць рашэнні самастойна.

Геракл не прывык думаць і ўяўляць, у яго жыцці ўсё ідзе па плане, аднак пасля сустрэчы з Герай да яго прыходзяць думкі, што можна ўсё змяніць: «He could find a ship, change his name. <…> What if he bent the future as easily as an iron bar? Could he not bend himself out of his fate, and leave fate to curve elsewhere? Why was he fixed, immoveable, plodding out his life like a magnificent ox? Why did he wear Hera‟s yoke? And for the first time he thought it was his own yoke he wore»[14] [3, p. 13]. Упершыню Геракл думае пра іншае жыццё, пра ўласны выбар. Сустрэча з Герай змяніла яго погляды.

Зразумець, што ты сам вырашаеш, як быць далей, – гэта адна справа, аднак зрабіць выбар значна цяжэй. Момантам, які мог падштурхнуць Геракла да дзеяння, стала сцэна спасення Прамітэя. Упершыню за доўгі час Геракл вырашае зрабіць нешта важкае. Ён угаворвае Зеўса змягчыць пакаранне, такім чынам змяняючы рашэнне багоў і лёс зняволенага. Аднак заставалася дзве справы, якія Геракл не мог вырашыць: вызваліць Атласа ад яго ярма і пазбавіцца свайго. Зрабіць ён гэтага не мог па адной прычыне: яму не хапіла смеласці: «Heracles never visited Atlas again, some combination of shame and fear kept him away. He had cheated to win, he knew that, but how could he blame himself? Blame Hera. Blame the gods for setting him impossible tasks; tasks that any other man would have failed»[15] [3, p. 29]. Геракл не выратаваў

---

[11] «– Мы ўсе павінны несці свой цяжар. Тваё пакаранне – трымаць Сусвет. Маё – працаваць на ідыёта» (Пераклад наш. – *А.Б.*).

[12] «Цяпер Гераклес баяўся больш, чым за ўсё сваё жыццё. Ён мог прыняць любы выклік, акрамя таго, калі выкліку не было. Ён ведаў сябе толькі ў баі. Ён вызначаў сябе, адштурхоўваючыся ад процілегласьцяў. Калі ён змагаўся, ён адчуваў, як працуюць яго мышцы і кроў пульсуе ў яго целе. Цяпер ён не адчуваў нічога, акрамя цяжару свету» (Пераклад наш. – *А.Б.*).

[13] «– Ты павінен загубіць сябе сам, Геракл.
– Але ты будзеш тут, каб дапамагчы мне з гэтым, ці не так, Гера?
– Калі я здаюся табе лёсам, то толькі таму, што ў цябе няма ўласнай сілы.
– Не было чалавека больш моцнага, чым я.
– Ні адзін мужчына не быў слабейшы за цябе.
– Ты гаворыш загадкамі, як жанчына.
– Тады я буду казаць адкрыта, як мужчына. Ні адзін герой не можа быць знішчаны светам. Яго ўзнагарода-знішчыць сябе самому. Не тое, што ты сустрэнеш на шляху, а тое, хто ты ёсць, знішчыць цябе, Геракл» (Пераклад наш. – *А.Б.*).

[14] «– Ён мог бы знайсці карабель, змяніць імя. Што, калі ён сагне будучыню так жа лёгка, як жалезны прут? Ці не мог ён ухіліцца ад свайго лёсу і пакінуць яго ў іншым месцы? Што трымае яго, не дазваляе рухацца, што прымушае яго цягнуць сваё жыццё, нібы вялізнага быка – непад'ёмны плуг? Чаму церпіць ярмо Геры? І тады ён упершыню падумаў, што гэта яго ўласнае ярмо» (Пераклад наш. – *А.Б.*).

[15] «– Геракл больш ніколі не наведваў Атласа, яго ўтрымлівалі сорам і страх. Ён схітрыў, каб выйграць, ён ведаў гэта, але як ён мог вінаваціць сябе? Вінаватая Гера. Вінаватыя багі, паставіўшы перад ім невыканальныя задачы, якія любы іншы чалавек не змог бы адолець» (Пераклад наш. – *А.Б.*).

Атласа, бо адчуваў віну перад ім. Ён не хацеў прасіць прабачэння за свае памылкі, думаючы апынуцца слабым у вачах тытана. Ён пабаяўся пераменаў, а таму і вырашыў заставіць усё на сваіх месцах.

Герой стараецца не думаць пра іншыя спосабы правесці жыццё, ён увогуле пачынае пазбягаць думак, так ён стараецца захаваць сваю зону камфорту, што ў яго добра атрымліваецца. Аднак гэта слабасць і становіцца прычынай яго гібелі.

ЛІТАРАТУРА

1. Поваляева, Н.С. Дженет Уинтерсон, или Возрождение искусства лжи / Н.С. Поваляева. – Минск : РИВШ, 2006. – 281с.
2. Тега, Е.В. Традиция Фрейда в системе персонажей романа Джанет Уинтерсон «Бремя» / Е.В. Тега // Преподаватель XXI век. – 2015. – № 1. Часть 2. – С. 378–385.
3. Winterson, J. Weight: The Myth of Atlas and Heracles. [Electronic resource] / J. Winterson. – 2005. – Mode of Acess: https://epdf.tips/weight-the-myth-of-atlas-and-heracles.html. – Date of access: 01.06.2019.